

**Народны літаратурна-краязнаўчы музей Якуба Коласа ў Пінкавічах запрасіў гасцей на вялікае свята. Ужо стала добрай традыцыяй адзначаць тут раённыя «Каласавіны». Так мілагучна называюцца мерапрыемствы, якія ладзяцца 3 лістапада, у дзень нараджэння класіка беларускай літаратуры.**



Удзельнікі «Каласавінаў».

# Творчасць паэта – на многія лета!

Святочная імпрэза ў Пінкавічах атрымалася асабліва ўзнёслай, бо была прысвечана 140-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. З традыцыйнымі вяршаванкамі-запрашанкамі сустракалі гасцей удзельнікі аб'яднання юных экскурсаводаў «ГіД» (гаваркія і дапытлівыя): «Свежыя навіны – у нас «Каласавіны», спяшайцеся хутчэй на свята ў музей!».

Ствараў добры настрой народны інструментальны ансамбль выкладчыкаў Пінкавіцкай дзяржаўнай сярэдняй школы Зоя Кондрацюк са сваімі калегамі: яны інсцэніравалі вершаванае апавяданне Якуба Коласа «За дождж». І камедыйны сюжэт, і яркія вобразы прыйшліся даспадобы гледачам. А як прыгожа гучала сакавітая беларуская мова падчас тэатралізаванай пастаноўкі ўрыўка з паэмы «Новая зямля»! Ролі бліскуча выканалі вучні Стытычаўскай сярэдняй школы, якія займаюцца пад кіраўніцтвам педагога дадатковай адукацыі Марыі Клімецкі... віцкай сярэдняй школы імя Якуба Коласа «Дамісолькі» пад апладысменты выканалі песню пра беларускую мову. Упрыгожваннем канцэрта стаў танцавальны нумар «Вышыванка», які падрыхтавалі ўдзельніцы калектыва «Сланечнікі» Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Пінскага раёна.

Сюрпрыз для літаратурна-краязнаўчага музея падрыхтавала таленавітая і шматгранная асоба – бібліятэкар Пінкавіцкай сельскай бібліятэкі Святлана Маша... та паслухалі выступленне беларускага літаратуразнаўцы, кандыдата філалагічных навук, дацэнта, нашай зямлячкі Вольгі Козіч. Цікава, што лініі лёсу звязваюць яе з Якубам Коласам – дзед Вольгі Ільінічны Мікіта Козіч, жыхар вёскі Пінкавічы, быў вучнем будучага народнага паэта. У музеі нават захоўваюцца яго ўспаміны пра «вучыцеля Міцкевіча», які быў добрым педагогам, а яшчэ дапамагаў сялянам у іх барацьбе з панам Скірмунтам за зямлю і балоты за...



**Жанна ВЕРЫЧ, метадыст Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Пінскага раёна:**

*– У гэтым годзе мы адзначаем 140-годдзе Якуба Коласа, а музею ў Пінкавічах налічваецца ўжо 32 гады. Прыемна, што наша ўстанова запатрабавана ў насельніцтва. Так, за мінулы месяц музей наведалі больш за 600 чалавек. Наша аўдыторыя – не толькі школьнікі, гэта навучэнцы каледжаў і студэнты, моладзь, дарослыя. Улетку мы праводзілі індывідуальныя экскурсіі для турыстаў з Мінска, Брэста, Гомеля і іншых гарадоў.*

*«Каласавіны» – наша брэндавае свята...*

ны ансамбль выкладчыкаў Пінкавіцкай дзяржаўнай школы мастацтваў «Мяцеліца», які выконваў фальклорныя мелодыі ў сучаснай апрацоўцы. Педагогі школы пранікнёна выканалі песню на словы Якуба Коласа «Мой родны кут», якая і адкрыла насычаную праграму.

Незабыўныя эмоцыі падаравалі прысутным педагог дадатковай адукацыі Жыд-

цтвам педагога дадатковай адукацыі Марыі Кліменкі.

Прыемна адзначыць, што моладзь прымала актыўны ўдзел у «Каласавінах». Так, здзівіў выкананнем рэп-кампазіцыі на беларускай мове студэнт Пінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Іван Дарашэнка. Сваю песню юнак прысвяціў сталіцы Палесся. Дзяўчаты з вакальнага калектыва Пінка-

тэкар Пінкавіцкай сельскай бібліятэкі Святлана Мажароўская. Яна вышыла вялікі партрэт Якуба Коласа, які здзіўляе сваёй рэалістычнасцю. Як адзначыла метадыст Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Пінскага раёна і гаспадыня музея ў Пінкавічах Жанна Верыч, гэты шэдэўр зойме пачэснае месца ў экспазіцыі памяці Песняра.

З захапленнем госці свя-

іх барацьбе з панам Скірмунтам за зямлю і балоты, за права лавіць рыбу.

Падарункам усім прысутным сталі песні і вершы ў выкананні членаў клуба літаратараў Піншчыны «Пінчукі» Віктара Мяцельскага, Анатоля Козіча, Галіны Лазіцкай, Людмілы Шклёды, Уладзіміра Вароніна і іншых.

**Наталля МІЛЕЎСКАЯ**

**Фота аўтара**

*з Мінска, Брэста, Гомеля і іншых гарадоў. «Каласавіны» – наша брэндавае свята. Уся краіна святкуе дзень нараджэння Якуба Коласа як класіка беларускай літаратуры, а на Палессі да гэтага часу помняць яго як настаўніка Пінкавіцкага народнага вучылішча, які працаваў тут з верасня 1904 па студзень 1906 года. Ва ўспамінах старажылаў вёскі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, малады настаўнік Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч паўстае як добры, душэўны, просты чалавек. Вось так жывуць успаміны над берагам Піны!*